Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

Серыя «Ведай і любі свой горад»

# Захавальнік гісторыі зямлі кобрынскай

да 75-годдзя з часу заснавання ўстановы культуры
**«Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава»**

**Інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік**

Кобрын
2021

УДК 016:069-908(476.7)
ББК 91.9:79(4Беи)
338

Серыя заснавана ў 2012 годзе

***Складальнік***
галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі
Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі *С. Д. Курачук*

338 **Захавальнік гісторыі зямлі кобрынскай** : інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын : цэнтральная раённая бібліятэка, 2021. - 88 с. : іл. – (Серыя «Ведай і любі свой горад»).

Інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік з серыі «Ведай і любі свой горад» прысвечаны 75-годдзю з часу заснавання ўстановы культуры «Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава». Выданне прадстаўлена гістарычнай даведкай, асноўнымі датамі музея і бібліяграфічным спісам крыніц. Змяшчае фотаздымкі з архіва музея імя А. В. Суворава. Паказальнік разлічаны на шырокае кола чытачоў, усіх, хто цікавіцца гісторыка-культурнай спадчынай роднага краю.

**УДК 016:069-908(476.7)**
**ББК 91.9:79(4Беи)**

© Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, 2021

# АД СКЛАДАЛЬНІКА

У Кобрыне ёсць месца, якое многія гады прыцягвае да сябе ўвагу кабрынчан і турыстаў. Гэта самы цэнтр горада, каля цэнтральнай плошчы, дзе размешчаны два незвычайныя будынкі. Першы будынак чымсьці нагадвае сярэднявечны замак з магутнымі сценамі, земляным валам, высокай дазорнай вежай і баявымі галерэямі. А другі, старадаўні белы домік пад высокім гонтавым дахам, здаецца, выпадкова апынуўся ў цэнтры сучаснага горада. Гэта Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава - адзін з найстарэйшых музеяў Брэсцкай вобласці, адзіны музей у Беларусі, непасрэдна звязаны з асобай вялікага расійскага палкаводца Аляксандра Суворава.

Кобрынскі музей з поўным правам лічыцца візітнай карткай горада, добра вядомым турыстычным брэндам. Тысячы людзей, землякі і шматлікія замежныя госці, штогод прыходзяць сюды. Наш горад вядомы далёка за межамі Беларусі ў тым ліку і дзякуючы таму, што музей наведвалі турысты з розных куткоў былога СССР. За 75 гадоў з часу адкрыцця ў музей прыходзіла не адно пакаленне кабрынчан. Стаўшы дарослымі, самастойнымі людзьмі, яны сёння прыводзяць у залы сваіх дзяцей і ўнукаў.

Інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік «Захавальнік гісторыі зямлі кобрынскай» выдадзены да 75-годдзя з дня заснавання музея імя А. В. Суворава.

Пачынаецца выданне гістарычнай даведкай, далей прыводзяцца асноўныя даты музея.

Бібліяграфічны спіс крыніц адлюстроўвае ўсе віды публікацый. Без упамінання пра кобрынскі музей не абыходзіцца ні адно даведачнае ці энцыклапедычнае выданне, якое тычыцца Кобрына. У спіс крыніц уключаны кнігі, брашуры, артыкулы з энцыклапедычных і даведачных выданняў, раздзелы з кніг, бібліяграфічныя выданні цэнтральнай раённай бібліятэкі. Спіс крыніц таксама змяшчае пералік публікацый з газет і часопісаў на беларускай і рускай мовах з 1950 па 2021 год. Адбор літаратуры завершаны ў маі 2021 года.

Кнігі размешчаны ў алфавіце аўтараў, назваў кніг, артыкулы – па гадах у зваротнай храналогіі, унутры года – у алфавіце аўтараў, загалоўкаў. Мова бібліяграфічных апісанняў адпавядае мове выданняў. Для раскрыцця зместу пры неабходнасці да запісаў даюцца кароткія анатацыі.

Бібліяграфічныя запісы ў паказальніку складзены ў адпаведнасці з міждзяржаўнымі стандартамі «ГОСТ 7.1-2003 Библиографическая запись. Библиографическое описание. Общие требования и правила составления», «ГОСТ 7.80-2000 Библиографическая запись. Заголовок. Общие требования и правила составления».

Даведачны апарат прадстаўлены алфавітным спісам перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік.

Выданне змяшчае фотаздымкі з архіваў Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А. В. Суворава, цэнтральнай раённай бібліятэкі.

Паказальнік разлічаны на шырокае кола чытачоў, усіх, хто цікавіцца гісторыка-культурнай спадчынай роднага краю, імкнецца больш даведацца пра горад Кобрын.

# ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА

***Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава створаны паводле рашэння Брэсцкага абласнога Савета народных дэпутатаў ад 6 ліпеня 1946 года «Аб арганізацыі Кобрынскага гісторыка-краязнаўчага музея імя Суворава», якое было прынята згодна з пастановай Бюро ЦК КПБ ад 18 чэрвеня 1946 года. У 1947 годзе профіль музея зменены на ваенна-гістарычны, з гэтай назвай і імем музей жыве і сёння. Для наведвальнікаў музей адкрыты 1 мая 1948 года. У 1950 годзе, да 150-годдзя з дня смерці А. В. Суворава, перад домам быў усталяваны бронзавы бюст палкаводца (скульптар П. Кюферле), абапал галоўнага ўвахода — дзве гарматы 1812 года.***

Музей імя А. В. Суворава, старадаўні асабняк у цэнтры Кобрына, вось ужо некалькі стагоддзяў называюць «домам Суворава».





У 1795 годзе імператрыца Кацярына ІІ падаравала вялікаму палкаводцу Аляксандру Васільевічу Сувораву, які атрымаў шмат ваенных перамог і не ведаў ніводнага паражэння, маёнтак Кобрынскі Ключ.

У сядзібе знакаміты палкаводзец жыў у 1797 і 1800 гадах. Любіў гуляць па алеях парку і плаваць у мясцовай

сажалцы, хадзіў на богаслужэнні ў Свята-Петрапаўлаўскую царкву і нават спяваў на кліра̀се ў хоры.

Пасля смерці А. В. Суворава дом неаднаразова мяняў сваіх уладальнікаў. Але сярод гараджан захавалася памяць пра самага знакамітага з іх, і таму за домам трывала і надоўга замацавалася назва «сувораўскі». Драўлянаму будынку, адзначанаму на плане Кобрына 1797 года, наканавана было не толькі ацалець у віхуры ваенных падзей, стаць часткай гісторыі, але і застацца яе захавальнікам.

На момант стварэння ў 1946 годзе музея ў наяўнасці быў толькі каркас будынка з перакошанымі сценамі і старым гонтавым дахам. Каб адкрыць музей, патрабаваўся капітальны рамонт. Пачынаць прыйшлося з «нуля»: забруджаны, паўразбураны будынак, ніводнага экспаната.

Шмат цяжкасцей давялося пераадолець дырэктару і адзінаму тады супрацоўніку музея Аляксею Міхайлавічу Мартынаву (1904–1999), які на працягу двух гадоў





А. М. Мартынаў на фоне сувораўскага дома 1945 г.
*(З архіваў кобрынскага музея)*

у адзінай асобе працаваў за калектыў музея. Зусім не знаёмы з музейнай справай, ён павінен быў адначасова аднаўляць дом і паралельна збіраць экспанаты. Аляксей Міхайлавіч нямала пакалясіў па прасторах былога Савецкага Саюза ў пошуках неабходных гістарычных прадметаў, якія маглі б стаць асновай для экспазіцыі. На працягу 32 гадоў А. М. Мартынаў быў дырэктарам музея, непасрэдна ім сабрана большасць экспанатаў з многіх музеяў былога Савецкага Саюза. Дзякуючы Аляксею Міхайлавічу імя Суворава стала брэндам горада, а ваенна-гістарычны музей - яго візітнай карткай.

Настойлівасць, энтузіязм А. М. Мартынава ўжо праз невялікі тэрмін прынеслі плённыя вынікі. Да канца 1947 года рамонтныя работы былі завершаны, у фондах налічвалася 663 экспанаты. Музей быў адкрыты ў рэкордна кароткі тэрмін. Сёння такія тэмпы стварэння экспазіцыі выклікаюць у прафесіяналаў здзіўленне і захапленне.

1 мая 1948 года пасля святочнай дэманстрацыі працоўных адбылося ўрачыстае адкрыццё музея. Экспазіцыя займала пяць залаў і мела тры раздзелы: «Нашы вялікія продкі», «А. В. Сувораў», «Айчынная вайна 1812 года». З'яўленне цікавага аб'екта культуры стала падзеяй для невялікага раённага цэнтра. Музей хутка набыў папулярнасць. Ужо да канца першага года існавання яго наведалі каля 17 тысяч чалавек.



*Экспазіцыя раздзела «А. В. Сувораў»*

Супрацоўніцтва з цэнтральнымі музеямі СССР садзейнічала значнаму папаўненню фондаў музея. У 1954 годзе вырашана перадаць у распараджэнне музея драўляны дом, пабудаваны ў 1920-я гады і размешчаны непадалёку ад сувораўскага. У 1960 годзе ў гэтым будынку разгарнулася экспазіцыя, якая складалася з двух раздзелаў: «Айчынная вайна 1812 года» і «Сувораўскія традыцыі ў рускай арміі».

Да пачатку 1970-х гадоў музей займаў плошчу 385 кв. м. Экспазіцыя была размешчана ў 16 залах, у якіх адлюстроўвалася ваенная гісторыя расійскай дзяржавы, пачынаючы з X стагоддзя і заканчваючы перыядам Вялікай Айчыннай вайны. Шэсць залаў прысвячаліся жыццю і дзейнасці А. В. Суворава.

Папулярнасць музея расла. У 1977 годзе яго наведалі 130 тысяч чалавек. Былі сабраны багатыя калекцыі халоднай і агнястрэльнай зброі, нумізматыкі, абмундзіравання і амуніцыі рускай арміі і армій тых краін, якія ў розныя часы процістаўлялі сваю ваенную моц рускай дзяржаве. Музей рускай ваеннай славы – так можна назваць тыя багатыя матэрыялы, якія былі сканцэнтраваны ў сувораўскім доміку ў Кобрыне.



У 1978 годзе дырэктар А. М. Мартынаў пайшоў на пенсію. Музейную эстафету падхапіла і годна пранесла Ніна Мяфодзьеўна Пліско (Кладчанка),

якая стала прадаўжальнікам яго справы. Ёй, як і папярэдніку, таксама давялося займацца будаўніцтвам, ажыццяўляць маштабную рэстаўрацыю старога сувораўскага дома, але ўжо ў іншых умовах. Будынку, які з вялікімі цяжкасцямі быў адрамантаваны адразу пасля Вялікай Айчыннай вайны, патрабавалася капітальная рэстаўрацыя з удзелам прафесіяналаў. Музей закрыўся на рамонт, яго цалкам перабудавалі. Па знойдзеных дакументах і вусных паданнях удалося часткова аднавіць былую планіроўку.

У пачатку 1980 года мастакі Мінскага мастацка-вытворчага камбіната пачалі афармляць музей. Сцены пафарбавалі ў тон салдацкага мундзіра другой паловы XVIII стагоддзя, а паміж вертыкальнымі вітрынамі паставілі лёгкія канструкцыі ў выглядзе штыка, што падкрэслівала дачыненне экспанатаў да армейскай тэмы.



15 лістапада 1980 года, да 250-годдзя з дня нараджэння А. В. Суворава, музей зноў быў адкрыты для наведвальнікаў.

Экспазіцыя, прысвечаная жыццю і дзейнасці вялікага палкаводца, праслужыла 33 гады, да кастрычніка 2013 года, калі сувораўскі дом быў зачынены на рамонт і рээкспазіцыю. Пасля двухгадовага перапынку інтэр'ер дома-музея значна змяніўся. Каларыт сувораўскай эпохі



ўзноўлены з такой дакладнасцю, што здаецца, быццам кожная рэч захоўвае цяпло свайго гаспадара. Уся экспазіцыя заснавана на сапраўдных прадметах XVIII стагоддзя, якія ствараюць непаўторную атмасферу часоў Суворава і Кацярыны II. Унікальныя ўзоры вайсковага абмундзіравання, зброі, дваранскага адзення і мэблі дапамагаюць акунуцца ў падзеі двухсотгадовай даўнасці. Экспазіцыя знаёміць з жыццём і ваеннай дзейнасцю Суворава, у тым ліку і з той, якая адбывалася на тэрыторыі сучаснай Беларусі.



1 красавіка 2016 года, напярэдадні Дня яднання народаў Беларусі і Расіі, урачыста адкрылася адноўленая экспазіцыя «Дом А. В. Суворава», і знакаміты сувораўскі дом прыняў наведвальнікаў.



У 1989 годзе быў узведзены новы будынак музея па праекце архітэктараў інстытута «Брэстграмадзянпраект» А. М. Анішчанкі і В. Ю. Тэртэля. Работа па афармленні залаў вялася ў 1990–1995 гадах. Над стварэннем экспазіцыі працаваў увесь калектыў музея. Аўтарам тэматыка-экспазіцыйнага плана з’яўлялася дырэктар музея Ніна Мяфодзьеўна Пліско, аўтарам мастацкага рашэння - мінскі мастак-афарміцель Юрый Леанідавіч Сухаў.



Экспазіцыя новага памяшкання музея «Сем стагоддзяў Кобрына» адкрылася 8 мая 1995 года. Паколькі экспазіцыя мемарыяльнага сувораўскага дома была прысвечана жыццю і дзейнасці А. В. Суворава, а накоплены матэрыял дазваляў разглядаць больш шырокае кола тэм, то ў аснову новай экспазіцыі лягла гісторыя горада Кобрына ў кантэксце ваеннай гісторыі Беларусі IX-XX стагоддзяў. У 16 залах

памяшкання адлюстроўваюцца асноўныя этапы гісторыі Кобрыншчыны са старажытных часоў да сучаснасці, асвятляюцца важнейшыя падзеі гісторыі краю. Сапраўдныя экспанаты XV-XIX стагоддзяў з'яўляюцца прадметам гонару музея. Працягвае экспазіцыю адкрытая пляцоўка баявой тэхнікі.



У фондах музея больш за 51 тысячу гістарычных прадметаў і дакументаў. Ёсць бібліятэка, якую ў сілу яе значнасці і багатых фондаў можна назваць трэцяй экспазіцыяй музея. Кобрынскі музей прапануе сваім наведвальнікам выставы і часовыя экспазіцыі па самых разнастайных тэмах і перыядах. Праводзяцца музейныя заняткі для дзяцей і моладзі. Да важнейшых гістарычных дат рыхтуюцца музейныя мерапрыемствы. З 1996 года ў музеі пастаянна дзейнічае выстаўка-продаж карцін кобрынскіх мастакоў, праводзяцца персанальныя выстаўкі мастакоў.

У студзені 2003 года кобрынскі музей быў прызнаны лепшым па выніках працы 2002 года сярод музеяў

Брэсцкай вобласці. Музею быў уручаны дыплом «Лепшы музей» Упраўлення культуры Брэсцкай вобласці.



З 2004 года дырэктарам музея працуе Алена Віктараўна Бабенка.

За значны уклад у развіццё музейнай справы, распрацоўку тэматычных экскурсій «Сувораў як асоба ў гісторыі», стварэнне народных, мастацкіх і этнаграфічных выстаў 31 снежня 2006 года Кобрынскаму ваенна-гістарычнаму музею імя А. В. Суворава прысуджана спецыяльная прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Прэмія Прэзідэнта з'явілася аб'ектыўнай ацэнкай дзейнасці калектыву ў юбілейны год музея (60 гадоў з часу заснавання).

Пошук каштоўных рэліквій супрацоўнікамі ўстановы вядзецца пастаянна. У залах музея можна знаходзіцца гадзінамі, вывучаючы прадстаўленыя экспанаты: рэдкія выданні кніг, дакументы, якія маюць дачыненне да Кобрына і яго наваколля, старажытную зброю, арыгінальную мэблю, прадметы сялянскага побыту, адзенне, ваеннае абмундзіраванне, жывапісныя палотны.

На сённяшні дзень Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава прадстаўлены дзвюма экспазіцыямі, адна з якіх змешчана ў суворaўскім доме, які з'яўляецца помнікам гісторыі XVIII стагоддзя рэспубліканскага значэння, другая - у новым будынку музея. Першая экспазіцыя, сувораўская хатка, - аснова, з якой 75 гадоў назад пачынаўся музей; другая - ахоплівае гісторыю Кобрына з часоў першага летапіснага згадвання пра горад па XX стагоддзе.

# *Цікавы факт*

За 75 гадоў Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава ўзначальвалі ўсяго толькі тры дырэктары:
з 1946 па 1978 год - **Мартынаў Аляксей Міхайлавіч**;
з 1978 па 2004 год - **Пліско Ніна Мяфодзьеўна**;
з 2004 года - **Бабенка Алена Віктараўна**.







А. М. Мартынаў правёў на капітанскім мосціку музея 32 гады. Яго пераемніца на пасадзе дырэктара Н. М. Пліско кіравала музеем 26 гадоў, але агульны стаж яе працы ў музеі таксама складае 32 гады. Вось такое цікавае супадзенне!

Нізкая «цякучасць» дырэктарскіх і іншых кадраў сведчыць у першую чаргу пра стабільнасць музея і пра тое, што ў гэтай установе працуюць людзі захопленыя і адданыя сваёй справе. Дырэктар і яго каманда верныя традыцыям мінулага і робяць усё магчымае, каб захаваць і прымножыць добрую славу Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А. В. Суворава і па праве ганарыцца сваёй 75-гадовай гісторыяй.



Музей - гэта ўнікальная ўстанова, месца, дзе здзяйсняюцца падарожжы ў часе. Захоўваючы і дэманструючы прадметы і дакументы, ён зберагае гістарычную памяць, духоўную спадчыну народа.

Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава паказвае прыклад сапраўднага шанавання нацыянальных святынь, вучыць паважаць мінулае, любіць і ведаць гісторыю сваёй малой радзімы.

# КОБРЫНСКІ МУЗЕЙ: АСНОЎНЫЯ ДАТЫ І ПАДЗЕІ

***1946 год, 18 чэрвеня***

Пастанова Бюро ЦК КПБ «Аб арганізацыі Кобрынскага гісторыка-краязнаўчага музея імя Суворава».

***1946 год, 6 ліпеня***

Брэсцкі абласны Савет народных дэпутатаў прыняў рашэнне аб арганізацыі музея.

***1946 год, 4 жніўня***

Прызначэнне А. М. Мартынава дырэктарам музея.

***1947 год***

Завяршэнне рэстаўрацыі сувораўскага дома.

***1948 год, 1 мая***

Урачыстае адкрыццё першай экспазіцыі ў сувораўскім доме.

***1949 год, 22 ліпеня***

Закрыццё музея на аварыйны рамонт.

***1950 год, 18 мая***

Паўторнае адкрыццё музея, устаноўка перад уваходам у музей бюста Суворава і двух гарматных ствалоў 1812 года.

***1954 год***

Перадача музею для пашырэння экспазіцыі драўлянага дома, пабудаванага ў 1928 годзе.

***1976 год***

Пік папулярнасці музея. Наведвальнасць музея дасягнула 136 тысяч чалавек у год (пры колькасці насельніцтва горада 27 тысяч чалавек).

***1978 год***

*1 мая*

А. М. Мартынаў пайшоў на пенсію. На пасту дырэктара яго змяніла Ніна Мяфодзьеўна Пліско (Кладчанка).

*1 чэрвеня*

Музей закрыўся на рэстаўрацыю.

***1979 год, снежань***

Завяршэнне рэстаўрацыйных работ.

***1980 год, 15 лістапада***

Адкрыццё экспазіцыі ў сувораўскім доме, якая прысвечана жыццю і дзейнасці А. В. Суворава.

***1982 год, жнівень***

Знесены аварыйны другі (драўляны) будынак.

***1984 год***

Выдадзены даведнік «Кобринский военно-исторический музей имени А. В. Суворова» (аўтар тэксту Н. М. Пліско).

***1987 год, сакавік***

Уведзена пасада галоўнага захавальніка фондаў.

***1987 год, жнівень***

Пачатак будаўніцтва новага цаглянага будынка па спецыяльным праекце.

***1989 год, снежань***

Завяршэнне будаўніцтва другога будынка музея.

***1995 год, 8 мая***

Адкрыццё другой музейнай экспазіцыі «Гісторыя Кобрына» ў новым будынку.

***1996 год, 29 верасня***

Святкаванне 50-годдзя музея.

***1997 год***

А. М. Мартынаву, былому дырэктару музея імя А. В. Суворава, прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін горада Кобрына».

***2003 год, студзень***

Музей прызнаны лепшым па выніках працы 2002 года сярод музеяў Брэсцкай вобласці, уручаны дыплом «Лепшы музей» Упраўлення культуры Брэсцкай вобласці.

***2004 год***

Дырэктарам музея прызначана Алена Віктараўна Бабенка.

Да 100-годдзя з дня нараждэння А. М. Мартынава на доме, дзе ён жыў, адкрыта мемарыяльная дошка.

***2005 год, лістапад***

Музей адзначыў адразу два юбілеі: 275-годдзе з дня нараджэння легендарнага рускага палкаводца А. В. Суворава і 25-годдзе з дня адкрыцця пасля рэканструкцыі экспазіцыі ў сувораўскім доме.

## *2006 год*

*кастрычнік*

Адбылася міжнародная канферэнцыя «Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава - 60 гадоў гісторыі».

*31 снежня*

Калектыў установы культуры «Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворова» ўдастоены спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Музейная справа» за арганізацыю выставачнай дзейнасці.

## *2008 год*

Выдадзены даведнік па Кобрынскаму ваенна-гістарычнаму музею імя А. В. Суворава «Экспозиция "Семь столетий Кобрина"» (аўтары тэксту А. В. Бабенка і А. М. Рысь).

## *2009 год*

Выдадзены даведнік па Кобрынскаму ваенна-гістарычнаму музею імя А. В. Суворава «Экспозиция "Суворовский дом"» (аўтары тэксту Н. М. Пліско і А. В. Бабенка).

У Кобрынскім ваенна-гістарычным музеі імя А. В. Суворава вяліся рамонтныя работы.

## *2010 год*

Кобрынскі музей адзначыў дзве юбілейныя даты: 30-годдзе стварэння экспазіцыі Сувораўскага дома і 15-годдзе экспазіцыі «Сем стагоддзяў Кобрына».

*26 сакавіка*

Рашэннем Кобрынскага Савета народных дэпутатаў № 118 адна з вуліц г. Кобрына атрымала назву – вуліца Мартынава.

***2011 год***

Упершыню ў Кобрынскім ваенна-гістарычным музеі імя А. В. Суворава прайшла акцыя «Ноч у музеі».

***2016 год, 1 красавіка***

Урачыстае адкрыццё абноўленай экспазіцыі «Дом А. В. Суворава».

***2019 год***

Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава - у спісе лепшых Нацыянальнага форуму «Музеі Беларусі».

У рамках 115-годдзя з дня нараджэння А. М. Мартынава праведзена першая навукова-практычная канферэнцыя «Мартынаўскія чытанні», ініцыятарам і арганізатарам якой выступіў Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава.

У намінацыі «Музейная дзейнасць» званне «Чалавек года» атрымала загадчык навукова-экспазіцыйнага аддзела Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А. В. Суворава Алена Мікалаеўна Рысь.

***2020 год***

У Кобрынскім ваенна-гістарычным музеі імя А. В. Суворава адбылася міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Сувораўскія чытанні».

# СПІС КРЫНІЦ

## *Кнігі, брашуры*




**Военно-историческому** музею им. Суворова 50 лет (1946-1996). – Кобрин,1996. - 7 с.




**Кобринский** военно-исторический музей имени А. В. Суворова : путеводитель / автор текста Н. М. Плиско. – Минск : Полымя, 1984. – 47 с. : ил.

**Кобринский** военно-исторический музей имени А. В. Суворова / автор текста А. М. Мартынов. – Минск, 1961.




**Кобринский** военно-исторический музей имени А. В. Суворова. Экспозиция «Семь столетий Кобрина» : краткий путеводитель / Кобринский военно-исторический музей им. А. В. Суворова ; [сост. текста Е. В. Бабенко, Е. Н. Рысь]. – Брест : Брестская типография, 2008. – 27 с.




**Кобринский** военно-исторический музей им. А. В. Суворова. Экспозиция «Суворовский дом» : краткий путеводитель / Кобринский военно-исторический музей им. А. В. Суворова ; [авт. текста Н. М. Плиско, Е. В. Бабенко]. – Брест : Брествестпресс, 2009. – 27 с. : фот.



**Кобринский** военно-исторический музей имени А. В. Суворова : буклет / учреждение культуры «Кобринский военно-исторический музей им. А. В. Суворова». – Кобрин, 2009.

**Кобринскому** военно-историческому музею им. А. В. Суворова 60 лет (1946-2006) : дайджест / учреждение культуры «Кобринский военно-исторический музей им. А. В. Суворова». – Кобрин, 2006.



**Пліско, Н. М.** Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава = Кобринский военно-исторический музей им. А. В. Суворова : даведнік / Н. М. Пліско. – Мінск : Полымя, 1990. – 93 с. : іл.

# *Артыкулы з энцыклапедычных выданняў*



**Бабенко, Е. В.** Кобринский военно-исторический музей имени А. В. Суворова / Е. В. Бабенко // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.] – Минск, 2007. – Т. 4. – С. 99-100 : фот.



**Кобрынскі** ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава // Культура Беларусі : энцыклапедыя : у 6 т. -. Мінск, 2013. - Т. 4. - С. 516.




**Кобрынскі** ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск, 1986. – Т. 3. – С. 88-89.




**Кобрынскі** ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава // Ваенная энцыклапедыя Беларусі = Военная энциклопедия Беларуси. - Мінск, 2010.-С. 525.




**Кобринский** военно-исторический музей имени А. В. Суворова // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. - Т. 1. - Брестская область : в 2 кн. – Минск, 2009. – Кн. 1. - С. 469-470.




**Кобринский** военно-исторический музей им. А. В. Суворова // Туристская энциклопедия Беларуси. - Минск, 2007. - С. 246–247.




**Кобринский** военно-исторический музей имени А. В. Суворова // Большой белорусский энциклопедический словарь. – Минск, 2011. – С. 166.




**Кобринский** военно-исторический музей // Брест : энциклопедический справочник. – Минск, 1987. – С. 234.




**Кулагін, А. М.** Кобрынскі сядзібны дом / А. М. Кулагін // Архітэктура Беларусі : энцыклапедычны даведнік. - Мінск, 1993. – С. 246-247.



**Мартынаў, А. М.** Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворова / А. М. Мартынаў // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. – Мінск, 1972. - Т. 6. - С. 44.

**Мартынаў, А. М.** Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворова / А. М. Мартынаў // Беларуская ССР : кароткая энцыклапедыя : [у 5 т.]. – Мінск, 1980. – Т. 3.- С. 273.




**Мартынов, А. М.** Кобринский военно-исторический музей имени А. В. Суворова / А. М. Мартынов // Белорусская ССР : краткая энциклопедия : [в 5 т.]. – Минск, 1980. – Т. 3. - С. 263.



**Плiско, Н. М.** Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворова / Н. М. Плiско // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1999. – Т. 8. - С. 370.

## *Артыкулы з кніг*




**Алисейчик, В. В**. Усадебный дом Суворова / В. В. Алисейчик, А. М. Мартынов // Свод памятников истории культуры Белоруссии. Брестская область. – Минск, 1990. – С. 252.




**Бабенка, А. В.** Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава. Кобринский военно-исторический музей имени А. В. Суворова / А. В. Бабенка // Музеі Беларусі = Музеи Беларуси. – Мінск, 2008. - С. 296–299 : фат.

**Дом** А. В. Суворова в Кобрине // По дорогам времени. Исторические памятники Белоруссии. – Минск, 1966. – С. 25.

**Истомин, В. С**. Москва - Брест : путешествие на автомобиле / В. С. Истомин. – Москва, 1977.

См. на с. 114.




**Кобрин**. Военно-исторический музей им. А. В. Суворова = Kobryn. Military and History Museum named after A. V. Suvorov // Брест и Гродно. Гродно и Брест. 100 достопримечательностей = Brest & Grodno. Grodno & Brest. 100 places to discover VISAFREE in Western Belarus : что посмотреть туристу без визы на западе Беларуси. – Брест, 2020. – С. 29.

**Кобринский** военно-исторический музей имени А. В. Суворова // Кобрин : [рекламное издание]. – Брест, 2012. – С. 4-7 : фот.




**Кобринский** военно-исторический музей им. А. В. Суворова // Туристские регионы Беларуси : справочное издание. – Минск, 2008. – С. 71.




**Кобринский** военно-исторический музей. Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава. Kobryn. Military and History Museum named after A. V. Suvorov // Музеи Беларуси = Музеі Беларусі = Museums of Belarus. – Минск, 2018. – С. 112-113.




**Кобринский** военно-исторический музей // По земле кобринской. Туристические маршруты. – Барановичи, 2004. - С. 10.




**Кобринский** район. Память об А. В. Суворове // 100 достопримечательностей Брестчины. – Брест, 2019. – С. 43 : фат.




**Кобрын:** гістарычная і архітэктурная спадчына [Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава] // Кобрын: мінулае і сучаснае. – Брэст, 2020. - С. 43-53 : фат.

**Кобрынскі** ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава // Па мясцінах ратнай славы = По местам ратной славы. – Мінск, 1983. – С. 18-21 : фат.

**Лупинович, И. С.** Памятник русской славы / И. С. Лупинович, А. Х. Шкляр. // По Белорусскому Полесью : географический очерк / И. С. Лупинович, А. Х. Шкляр. - Минск, 1958. – С. 50-53.

Музей А. В. Суворова и памятник Отечественной войны 1812 г. в г. Кобрине.




**Мешечко, Е. Н.** Кобринский военно-исторический музей / Е. Н. Мешечко // Путешествие по Беларуси. В краю Немана, Западного Буга и Припяти : путеводитель / Е. Н. Мешечко. - Брест, 2012. – С. 116.




**Пліско, Н. М.** Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава / Н. М. Пліско // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 500–502.




**Рэнесансавая** мэбля ў Кобрынскім ваенна-гістарычным музеі // Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння : зборнік артыкулаў. - Мінск, 1994. - С. 132–135.

**Садоўскі, Я.** Сувораў у Беларусі / Я. Садоўскі // Гістарычныя помнікі Беларусі / Я. Садоўскі. – Мінск, 1958. – С. 6-8 : фота.




**Сядзібны** дом Суворава Аляксандра Васільевіча // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Брэсцкая вобласць. – Мінск, 1984. - С. 226.

**Чернатов, В.** Памятники военной истории и боевой славы / В. Чернатов. – Минск : Полымя, 1989. – 34 с.

См. на с. 4.




**Шиманский, М.** Живая память. Музей Суворова в Кобрине / М. Шиманский // Земля, где я живу : путевые заметки журналиста / М. Шиманский. - Минск, 1980. - С. 59–65.

# *Бібліяграфічныя выданні цэнтральнай раённай бібліятэкі*

**Візітная картка горада** : бібліяграфічны паказальнік




да 70-годдзя з часу заснавання Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А. В. Суворава / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2016. – 28 с. : фат.

**Краязнавец з вялікай літары** : біябібліяграфічны паказальнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – 2-е выд., дапрац. і дап. – Кобрын : цэнтральная раённая бібліятэка, 2019. - 56 с. : іл. – (Серыя «Асоба ў гісторыі малой радзімы»).




**Краязнавец з вялікай літары** : біябібліяграфічны паказальнік / УК «Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка», аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. - Кобрын, 2014. – 48 с.




**Краязнаўцу і гісторыку прысвячаецца** : каляндар урачыстасцей да 110-годдзя з дня нараджэння А. М. Мартынава / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2014. – 8 с.




**Летапісец кобрынскага музея** : зборнік артыкулаў А. М. Мартынава аб ваенна-гістарычным музеі / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. П. Сысоева. - Кобрын, 2014. – 80 с.




**Памяць сэрца** : тэма Вялікай Айчыннай вайны ў публікацыях А. М. Мартынава / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. П. Сысоева. - Кобрын, 2014. – 84 с.




**Стаяў у вытокаў**… : буклет аб установах горада Кобрына, да якіх меў дачыненне А. М. Мартынаў / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. Ю. П. Пракапук ; рэд. С. Д. Курачук. - Кобрын, 2014.




**Асоба ў гісторыі Кобрына**. Аляксей Міхайлавіч Мартынаў // Каб не абарвалася нітка памяці… : нарыс аб краязнаўцах Кобрыншчыны / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук. – Кобрын, 2009. - С. 2-12.




**Ганаровыя грамадзяне горада Кобрына.** Мартынаў Аляксей Міхайлавіч // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук. – Кобрын, 2020. – С. 15-22.




**120 гадоў з дня нараджэння А. М. Мартынава (1904)** // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 129.

# СПІС
# артыкулаў з перыядычных выданняў

## *2021 год*

**Бакун, Е.** В ожидании чуда… / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. – 2021. – 6 студзеня (№ 2). – С. 5 : фот.

В дни рождественских святок сотрудники музея им. А. В. Суворова организовали уютные посиделки у камина.

**Бакун, Е.** Загадки истории от ночи музеев / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. – 2021. – 22 мая (№ 40). – С. 4.

В свою юбилейную 10-ю ночь музеев кобринский музей отошёл от привычной формы проведения и организовал её в формате веб-квеста.

**Бакун, Е.** Память жива / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. – 2021. – 8 мая. – С. 7 : фот.

В кобринском музее организована выставка «В памяти нашей сегодня и вечно все они живы», посвящённая 80-летию начала Великой Отечественной войны.

**Бакун, Е.** Следом за рождественской звездой / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2021. - 2 студзеня (№ 1). - С. 12 : фот.

В кобринском музее возродили батлейку и показали первый мини-спектакль «Под светом Вифлиемской звезды».

**Белов, Д**. Белорусы на защите Сталинграда / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. – 2021. – 6 лютага (№ 11). – С. 9 : фот.

Выставочный проект «Белорусы на защите Сталинграда» открыт в Кобринском военно-историческом музее им. А. В. Суворова.

**Вовк, Ю.** «Арифметика» Магницкого, или Врата познания / Юлия Вовк // Кобрин информ. – 2021. – 18 марта (№ 11). – С. 3 : фот.

К 75-летию со дня основания музея в учреждении проходят выставки одного предмета – старинная книга «Арифметика» Леонтия Магницкого.

**Вовк, Ю.** Ах, эти новогодние чудеса в музее! / Юлия Вовк // Кобрин информ. – 2021. – 21 января (№ 4). – С. 3 : фот.

В кобринском музее проходят рождественские вечера у камина.

**Вовк, Ю.** Ночь в музее по-новому / Юлия Вовк // Кобрин-информ. – 2021. – 20 мая (№ 20). – С. 3 : фот.

Акция «Ночь в музее», посвящённая 75-летию музея, прошла в новом формате.

**Дыхание** ренессанса // Навіны Камянеччыны. – 2021. – 13 лютага (№ 7). – С. 5.

К 75-летию учреждения в кобринском музее проходят выставки одного предмета.

**Кирилюк, Л**. Воротник с историей / Лилия Кирилюк // Кобрин-информ. – 2021. – 22 апреля (№ 16). – С. 2 : фот.

В рамках проекта кобринского музея «Экспонат для любопытных, или Из тайников музея» - о предмете, имеющем отношение к униформе XIX в. и к представителю династии Романовых.

**Кирилюк, Л.** Кресло эпохи Ренессанса / Лилия Кирилюк // Заря. – 2021. – 10 февраля (№ 11). – С. 24 : фот.

В Кобринском военно-историческом музее им. А. В. Суворова продолжают проект выставок одного предмета, подготовленных к 75-летию учреждения.

**Кирилюк, Л.** Легендарный маузер в кобринском музее / Лилия Кирилюк // Кобрин-информ. – 2021. – 13 мая (№ 19). – С. 19 ; Кобрынскі веснік. – 2021. – 19 мая (№ 39). – С. 8 : фот.

Маузер, личное оружие ветерана, почётного гражданина города Кобрина Д. К. Борисова, освобождавшего г. Кобрин, стал «героем» выставки одного предмета в рамках проекта кобринского музея.

**Кирилюк, Л**. Страницы истории / Лилия Кирилюк // Кобрин-информ. – 2021. – 13 мая (№ 19). – С. 23.

Кобринский музей представил предметы из своих коллекций в рамках проекта Брестского областного краеведческого музея, посвященного Дню Победы и Международному дню музеев.

**Кирилюк, Л.** «Экспонат для любопытных, или Из тайников музея» / Лилия Кирилюк ; фото Юрия Киндина // Кобрин-информ. – 2021. - 21 января (№ 3). – С. 19 : фот. ; 11 февраля (№ 6). — С. 2 : фот.

В Кобринском военно-историческом музее им. А. В. Суворова будут выставлены экспонаты, которые ранее нигде не экспонировались.

**Кирилюк, Л.** Экспонат для любопытных, или Из тайников музея / Лилия Кирилюк // Кобрынскі веснік. – 2021. – 17 лютага. – С. 8 : фот. ; 21 красавіка. – С. 6.

Кобринский военно-историческом музей им. А. В. Суворова продолжает серию выставок одного предмета.

**Козлович, В**. Клады выставят на обозрение / Валентина Козлович // Народная газета. – 2021. – 7 мая (№ 18). – С. 18-19 : фот.

В юбилейном для кобринского музея году посетители увидят предметы, которые никогда не выставлялись.

**Козлович, В**. Экспонат из тайников / Валентина Козлович // СБ. Беларусь сегодня. – 2021. – 13 апреля (№ 68). – С. 11 : фот.

Кобринский военно-исторический музей в юбилейный год представляет свои раритеты.

**Мануйлик, М.** Белорусская дача Суворова / Марина Мануйлик ; фото Вадима Якубёнка // Культура. – 2021. – 13-19 мая (№ 19). – С. 29 : фот.

О самых ценных экспонатах кобринского музея.

**Сергеев, И.** Арифметика времён Петра I / Иван Сергеев // Заря. – 2021. – 20 марта (№ 22). – С. 11.

В кобринском музее выставили очередной старинный предмет в рамках проекта «Экспонат для любопытных, или Из тайников музея».

**Сергеев, И.** Экспонаты для самых любопытных / Иван Сергеев // Заря. – 2021. – 6 февраля (№ 10). – С. 9 : фот.

Новый проект стартовал в Кобринском военно-историческом музее им. А. В. Суворова.

**Фридлендер, Н.** Уникальная книга 1703 года — «Арифметика» Леонтия Магницкого / Наталья Фридлендер // Кобрынскі веснік. – 2021. – 6 сакавіка (№ 19-20). – С. 14.

Сотрудники кобринского музея им. А. В. Суворова представили очередной экспонат выставки одного предмета.

**Чирун, А.** Белорусы в Сталинградском сражении / Александр Чирун // Кобрин-информ. – 2021. – 4 февраля (№ 5). – С. 3 : фот.

В кобринском музее представлена выставка «Белорусы на защите Сталинграда», посвященная белорусам — участникам Сталинградской битвы.

## *2020 год*

**Арсентьева, С.** Кобринские дни Александра Суворова / Софья Арсентьева // Народная газета. - 2020. — 4 декабря (№ 49). — С. 11 : фот.

**Бакун, Е.** Личность в истории / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. – 2020. – 25 лістапада (№ 91). – С. 8 : фот.

В Кобринском военно-историческом музее им. А. В. Суворова 290-ю годовщину со дня рождения выдающегося полководца отметили «Суворовскими чтениями».

**Бакун, Е.** Сваха встречает гостей / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. – 2020. – 19 жніўня (№ 64). – С. 4 : фот.

Состоялось совместное мероприятие Кобринского военно-исторического музея им. А. В. Суворова и Кобринской центральной районной библиотеки «В гости к свахе».

**Беларускі** каляндар. 2021 год. Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава // Новыя кнігі : па старонках беларускага друку. - 2020. - № 9. - С. 3. - (дадатак).

18 чэрвеня - Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава, УК (г. Кобрын; 1946) – 75 гадоў з часу заснавання.

**Вовк, Ю.** И помнит мир спасенный... / Юлия Вовк // Кобрин-информ. - 2020. — 21 мая (№ 21). — С. 3 : фот.

В Кобринском военно-историческом музее им. А. В. Суворова открылась выставка, посвященная 75-летию Великой Победы.

**Елизарова, Ж.** Нескучная пятница / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2020. — 5 жніўня (№ 60). — С. 4 : фот.

Сотрудники Кобринского военно-исторического музея им. А. В. Суворова реализуют проект «Нескучная пятница».

**Кондрашук, Н.** История — это нескучно и увлекательно / Наталья Кондрашук // Кобрин-информ. - 2020. — 30 июля (№ 31). — С. 3 : фот.

В Кобринском военно-историческом музее им. А. В. Суворова проходят «Нескучные пятницы в музее».

**Пономарева, А.** И вновь в гостях у свахи / Анжелика Пономарева // Кобрин-информ. - 2020. — 20 августа (№ 34). — С. 3 : фот.

Центральная районная библиотека и военно-исторический музей им. А. В. Суворова пригласили друзей «В гости к свахе».

**Рысь, Е.** А. В. Суворов: реалии прошлого и современность / Елена Рысь // Кобрин–информ. – 2020. – 26 ноября (№ 48). – С. 3–4.

В Кобринском военно-историческом музее им. А. В. Суворова состоялась Международная научно-практическая конференция «Суворовские чтения».

## *2019 год*

**Бакун, Е.** Лишь стоит преступить его порог ... / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2019. — 13 сакавіка. — С. 6.

Елена Рысь, заведующий научно-экспозиционным отделом Кобринского военно-исторического музея имени А. В. Суворова, — «Человек года в сфере культуры».

**Бакун, Е**. Ночь искателей сокровищ / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2019. — 22 мая. — С. 4.

В Кобринском военно-историческом музее имени А. В. Суворова состоялась акция «Ночь музеев».

**Бакун, Е.** Смысл жизни — в служении людям / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2019. - 20 ліпеня. - С. 12 : фот.

О библиотекаре Кобринского военно-исторического музея имени А. В. Суворова Л. И. Курашовой.

**Гребенников, О**. Больше чем музей / Олег Гребенников // Заря. - 2019. — 9 октября. — С. 8.

Кобринский военно-исторический музей имени А. В. Суворова — в списке лучших Национального форума «Музеи Беларуси».

**Оживший** мундир // Кобрин-информ. - 2019. - 10 октября (№ 41). - С. 2.

Работа Кобринского военно-исторического музея имени А. В. Суворова отмечена специальным дипломом Национального форума «Музеи Беларуси».

**Оживший** мундир из музея отмечен специальным дипломом // Кобрынскі веснік. - 2019. - 16 кастрычніка. – С. 4 : фот.

Кобринский военно-исторический музей имени А. В. Суворова.

**Рагін, Я.** Пераможцы вядомы, але інтрыга застаецца / Яўген Рагін // Культура. - 2019. - 26 студзеня (№ 4). - С. 2.

Загадчык экспазіцыйнага аддзела Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А. В. Суворава А. Рысь — прэтэндэнт на званне «Чалавек года» ў намінацыі «Музейная дзейнасць».

**Рагін, Я.** Сярод лепшых — і наша Настасся / Яўген Рагін // Культура. - 2019. — 23 лютага (№ 8). — С. 5.

У намінацыі «Музейная дзейнасць» званне «Чалавек года» атрымала загадчык экспазіцыйнага аддзела кобрынскага музея А. Рысь.

**Савчук, М.** Все дороги ведут в музей / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. – 2019. – 1 августа (№ 21). – С. 2.

В День города Кобринский военно-исторический музей им А. В. Суворова по традиции представил кобринчанам и гостям города две уникальные выставки.

**Савчук, М.** Между прошлым и будущим / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2019. — 21 ноября (№ 47). — С. 3 : фот.

Военно-исторический музей имени А. С. Суворова пополняется не только экспонатами военной тематики, но и картинами кобринских художников.

**Савчук, М.** «Остров сокровищ», или всё о коллекциях, раритетах и коллекционерах / Маргарита Савчук // Кобрин информ. – 2019. – 23 мая. – С. 4.

«Ночь в музее» для жителей Кобринщины стала долгожданным и в очередной раз незабываемым событием, наполненным культурно-досуговыми мероприятиями.

## *2018 год*

**Бакун, А.** Ноч дабрыні і спагады / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2018. — 23 мая. — С. 2.

Кобрынскі ваенна-гістарычны музей далучыўся да акцыі «Ноч у музеі».

**Вовк, Ю.** Библиотечная фея / Юлия Вовк // Кобрин-информ. - 2018. — 15 марта. — С. 3.

О заведующей библиотекой Кобринского военно-исторического музея Л. И. Курашовой.

**Вовк, Ю.** Музей просыпается : арт-бессонница вновь пришла в Кобрин / Юлия Вовк // Кобрин-информ. - 2018. — 24 мая. — С. 2.

В Кобринском военно-историческом музее им. А. В. Суворова прошла «Ночь музеев».

**Вовк, Ю.** «Не гаснет памяти свеча ...» / Юлия Вовк // Кобрин-информ. - 2018. — 25 января. — С. 2.

В Кобринском военно-историческом музее им. А. В. Суворова прошло открытие выставки «Не гаснет памяти свеча ...».

**Грэчка, І.** Музей дружалюбны да дзяцей / Ігар Грэчка // Настаўніцкая газета. - 2018. — 17 лістапада. — С. 12-13.

Супрацоўнікі Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А. В. Суворава прымалі актыўны ўдзел у правядзенні круглага стала «Музейная педагогіка Беларусі».

**Мы будем** вечно помнить эту боль // Кобрынскі веснік. - 2018. — 12 мая. — С. 3.

Сотрудники Кобринского военно-исторического музея им. А. В. Суворова проводят музейно-педагогические занятия для учащихся.

**Часовитина, Н.** Кобринский Ключ графа Суворова / Наталья Часовитина // Сельская газета. - 2018. - 24 ноября. - С. 15-18.

Часть жизни русского полководца А. В. Суворова тесно переплетается с Кобринщиной.

## *2017 год*

**Жук, Е.** Чайное путешествие под музейной крышей / Елена Жук // Вечерний Брест. - 2017. — 17 ноября. — С. 5.

Сотрудники кобринского музея проводят для посетителей интерактивные музейно-педагогические занятия.

**Казакова, А.** «Мой адрес — Советский Союз» / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2017. — 25 мая. — С. 3.

В Кобринском военно-историческом музее имени А. В. Суворова прошла акция «Ночь в музее».

**Савчук, М.** Кобрин туристический / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2017. — 2 ноября. — С. 2.

В рекламно-информационный тур по территории Кобринского района включено посещение Кобринского военно-исторического музея имени А. В. Суворова.

## *2016 год*

**Бабенко, Е.** Имя в истории / Елена Бабенко // Кобрин-информ. — 2016. — 14 января. — С. 5.

Доклад директора Кобринского военно-исторического музея о масштабе личности А. В. Суворова в рамках международной научно-практической конференции.

**Бабенко, Е.** К 70-летию Кобринского музея: прошлое и настоящее / Елена Бабенко // Кобрин-информ. - 2016. - 4 августа. - С. 5.

Кобринский военно-исторический музей отметил 70-летие со дня основания.

**Бабенко, Е.** Музей великого полководца / Елена Бабенко // Старый Цейхгауз. – 2016. - № 3. – С. 132-136.

К 70-летию Кобринского военно-исторического музея им. А. В. Суворова.

**Бабович, В.** Галантный век Суворова / Виктория Бабович // Сельская газета. — 2016. — 5 апреля. — С. 4.

Музей им. А. В. Суворова в Кобрине открылся после реставрационных работ.

**Белов, Д.** У музея - юбилей! / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. — 2016. — 28 верасня. — С. 1, 2.

Прошли мероприятия празднования 70-летия Кобринского военно-исторического музея им. А. В. Суворова.

**В рамках** сотрудничества: музей - газета // Кобрин-информ. — 2016. — 7 января. — С. 7.

На базе кобринского музея состоялась Международная научно-практическая конференция «Имя в истории: Александр Васильевич Суворов», посвященная 285-летию со дня рождения Суворова.

**Волков, С.** Реконструкция прошлого / Сергей Волков // Заря. — 2016. — 5 апреля. — С. 1, 3.

В Кобрине открылся обновленный дом Суворова.

**Гребенников, О.** Как посетить все музеи сразу? / Олег Гребенников // Заря. — 2016. — 8 октября. — С. 7.

Работники Кобринского военно-исторического музея им. А. В. Суворова представили свою работу и фрагменты лучших экспозиций на III Национальном форуме «Музеи Беларуси».

**Заруба, С.** Жемчужине Кобринщины - 70 / Светлана Заруба // Кобрынскі веснік. - 2016. - 8 кастрычніка. - С. 4 ; 2016. - 12 кастрычніка. - С. 5.

Создание и развитие Кобринского военно-исторического музея им. А. В. Суворова через призму архивных документов.

**Казакова, А.** Для нас оживили прошлое / Анна Казакова // Кобрин-информ. — 2016. — 19 мая. — С. 5.

В Кобринском военно-историческом музее им. А. В. Суворова прошла «Музейная ночь».

**Казакова, А.** Здесь чувствуешь дыхание истории / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2016. - 7 апреля. - С. 3.

После более чем двухлетней реэкспозиции состоялось открытие Дома-музея А. В. Суворова.

**Казакова, А.** С юбилеем, Дом муз! / Анна Казакова // Кобрин-информ. — 2016. — 29 сентября. — С. 2.

Состоялось торжество, посвященное 70-летию музея им. А. В. Суворова.

**Казакова, А.** Суворовский домик встречает гостей / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2016. - 31 марта. - С. 5.

Разговор с директором дома-музея А. В. Суворова Еленой Бабенко об открытии обновленной экспозиции в суворовском усадебном доме.

**Канецкий, А.** В нашем полку прибыло / Алексей Канецкий // Кобрин-информ. - 2016. — 14 июля. — С. 2.

Экспозиция кобринского музея пополнилась еще одним экспонатом - советским артиллерийским орудием (дивизионная пушка Д-44).

**Кирилюк, Л.** «Бенефис музейных раритетов» / Лилия Кирилюк // Кобрин-информ. - 2016. - 9 июня. - С. 26.

В кобринском музее открылась выставка экспонатов из запасника музея.

**Кирьянов, А.** Царский генералиссимус в Кобрине / Артем Кирьянов // Советская Белоруссия. — 2016. — 3 июня. — С. 12.

Жизнь А. В. Суворова в Кобрине и история открытия военно-исторического музея им. А. В. Суворова.

**Кладченко, Н.** Реальная роль великого российского полководца А. В. Суворова в истории белорусской государственности / Нина Кладченко // Кобрин-информ. — 2016. — 2 июня. — С. 5.

Выступление в рамках международной научно-практической конференции Н. Кладченко, директора кобринского музея, о роли А. В. Суворова в историческом прошлом.

**Лепешко, Б.** Наш культурный слой / Борис Лепешко // Советская Белоруссия. — 2016. — 2 февраля. — С. 10.

Роль Кобринского военно-исторического музея им. А. В. Суворова в контексте истории.

**Павловский, Б.** Генералиссимус Суворов: герой или антигерой? / Борис Павловский // Вечерний Брест. — 2016. — 22 июля. — С. 8.

Директор музея Елена Бабенко сетует на рост антисуворовских настроений, считая их необоснованными. Личность А. В. Суворова в истории г. Кобрина.

**Павловский, Б.** О доблестях, о подвигах, о славе... / Борис Павловский // Вечерний Брест. - 2016. - 1 апреля. - С. 6.

После обновления и ремонта интерьер и экспозиции «Суворовского домика» стали более зрелищными и насыщенными.

**Пашкович, Л.** «Купите в прошлое билет...» / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. — 2016. — 18 мая. — С. 2.

Акция «Ночь в музее» была посвящена 70-летию военно-исторического музея им. А. В. Суворова.

**Тимошук, А.** В гости к Суворову / Анна Тимошук // Кобрынскі веснік. — 2016. — 6 красавіка. — С. 1, 2.

После реставрационных работ состоялось торжественное открытие экспозиции «Дом А. В. Суворова» музея.

**Тимошук, А.** Пистолет от командира полка / Анна Тимошук // Кобрынскі веснік. — 2016. — 7 мая. — С. 3.

Пистолет немецкой фирмы «Маузер», принадлежавший Д. Борисову, участнику освобождения Кобрина, хранится в музее им. А. В. Суворова.

**Чарнякевіч, Ю.** Дом, які абнавілі ў Кобрыне / Юрый Чарнякевіч // Культура. — 2016. — 16 красавіка. — С. 3.

Дом-музей А. В. Суворава адкрыўся праз два гады пасля рэканструкцыі.

**Этот** день в истории : 18 июня 1946 г. // Советская Белоруссия. — 2016. — 18 июня. — С. 24.

## *2015 год*

**Волков,** С. История на стендах / Сергей Волков // Заря. - 2015. — 14 мая. — С. 2.

Одной из постоянных экспозиций Кобринского военно-исторического музея исполнилось 20 лет.

**Гужалоўскі, А.** Мікалай Улашчык – аматар і знаўца музейнай справы / Аляксандр Гужалоўскі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2015. - № 2. – С. 21-27.

Гл. на с. 23.

**Казакова, А.** В музеи ходят по ночам / Анна Казакова // Кобрин-информ. – 2015. – 21 мая. – С. 3.

Акция «Ночь в музее» Кобринского военно-исторического музея им. А. В. Суворова в этом году была посвящена 70-летию Победы.

**Казакова, А**. О «мертвой петле» Нестерова, Ролане Гарросе и усах Вильгельма / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2015. — 12 февраля. — С. 7.

Экспонаты выставки «Первая мировая война в плакатном искусстве», организованной в музее, собраны его первым директором А. М. Мартыновым.

**Канецкий, А.** Интерактивная экскурсия продолжается / Алексей Канецкий // Кобрынскі веснік. - 2015. — 23 снежня. — С. 4.

Сотрудники музея подготовили тематическую обзорную экскурсию «Великая Отечественная война на Кобринщине».

**Новыя** выставы ў музеі // Народная трыбуна. - 2015. — 31 ліпеня. — С. 3.

У Кобрынскім ваенна-гістарычным музеі імя А. В. Суворава адкрыліся дзве новыя выставы.

**Федаровіч, І**. Святкуе горад Перамогу! / Ігар Федаровіч // Кобрынскі веснік. – 2015. - 20 мая. – С. 1.

У Кобрынскім ваенна-гістарычным музеі імя А. В. Суворава прайшла «Музейная ноч 2015».

## *2014 год*

**Белов, Д.** Убийственная красота / Дмитрий Белов ; фото автора // Кобрынскі веснік. - 2014. —10 мая. — С. 12.

В музее открылась выставка огнестрельного и холодного оружия.

**Военно-исторический** музей имени А. В. Суворова в Кобрине // Вечерний Брест. - 2014. — 15 августа. — С. 11.

**Дубіна, Л**. Цацка - па-за часам / Людміла Дубіна ; фота аўтара // Кобрынскі веснік. - 2014. - 2 жніўня. - С. 10.

У ваенна-гістарычным музеі праводзіцца выстава рэтра-цацкі «Цацка і час».

**Казакова, А.** Между пушкой и мушкетом / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2014. -15 мая. - С. 7.

В кобринском музее открылась выставка огне-стрельного и холодного оружия.

**Казакова, А.** Музейная ночь опустилась над городом / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2014. - 22 мая. - С. 3.

Акция «Ночь музеев» кобринского музея посвящена 425-летию со дня получения Кобрином Магдебургского права.

**Кирилюк, Л.** Парад игрушек в музее / Лилия Кирилюк // Кобрин-информ. - 2014. — 10 апреля. — С. 5.

Музей обращается с просьбой к жителям Кобрин-щины помочь в сборе игрушек для выставки «Парад ретро-игрушек».

**Курашова, Л.** Московские гости на кобринской земле / Лидия Курашова // Кобрин-информ. - 2014. - 24 июля. – С. 7.

Сотрудники военно-исторического музея принимали в своих стенах внучку Дмитрия Кузьмича Борисова, одного из освободителей Кобрина в июле 1944 года.

